# ГАРМОНІК У ТРАДЫЦЫЙНАЙ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

**Яканюк Н. П.**
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар,*
*загадчык кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод беларускіх музычных інструментаў ці не самая вялікая доля пагарды дасталася гармоніку. Вядомы этнограф Раманаў характарызаваў гармонік ў адпаведнасці з народным поглядам, як «сімвал разбэшчанасці і распушчанасці моладзі, ўжо паспеўшай укусіць плады фабрычнай цывілізацыі». М. Прывалаў, аўтар першага нарыса аб беларускіх музычных інструментах, нават не бачыў неабходнасці ў апісанні інструмента, які «сваім трафарэтным, пошлым гукам знішчае традыцыйны фальклор». На тэрыторыі Беларусі гармонік зацвярджаўся доўга і нераўнамерна. Тым не менш, сёння гэты інструмент займае вядучае становішча у традыцыйнай народнай музычна-інструментальнай практыцы, заняўшы месца, якое раней належала дудзе, скрыпцы, цымбалам.

Аб беларускім гармоніку і зараз яшчэ няма спецыяльных даследаванняў, нягледзячы на звыш чым стогадовую гісторыю існавання гэтага запазычанага інструмента ў традыцыйнай культуры беларусаў. Звесткі аб беларускім гармоніку далёка няпоўныя. Сярод найбольш цікавых работ адзначым публікацыі І.Назінай. Вельмі сціплы эпізод, прысвечаны гармоніку ў вядомай манаграфіі [4], крыху пашыраны аўтарам ў адпаведным раздзеле работы больш позняга часу [5]. Найбольш цікавыя назіранні і абагульненні аб канструкцыйных разнавіднасцях беларускіх гармонікаў і выканальніцкім майстэрстве вясковых гарманістаў прыведзены ў адной з апошніх публікацый І. Назінай, тыраж якой, нажаль, вельмі абмежаваны [6]. У манаграфіях А. Скорабагатчанка таксама ёсць старонкі, прысвечаныя гармоніку. Аўтар звяртае ўвагу на фарміраванне гукаідэалу гармонікаў Паазер’я, спыняецца на традыцыі вырабу гэтага інструмента мясцовымі майстрамі, характарызуе некаторыя рэгіянальныя і індывідуальныя асаблівасці выканальніцкай манеры пастаўскіх гарманістаў [7, 8]. У аналіз публікацый аб беларускім гармоніку неабходна ўключыць два навукова-папулярныя артыкулы У. Берберава, прысвечаныя гармонікам вядомых беларускіх майстроў А. Шчуроўскага, К. Кіргета і інш. [1, 2].

Мэта нашага артыкула – вызначыць ролю гармоніка ў традыцыйнай інструментальнай культуры Беларусі. У гэтай сувязі акрэслім, як асобныя задачы, уплыў гармоніка на традыцыйны гукаідэал, інструментарый, жанравую структуру інструментальнай музыкі і музычнае мысленне беларусаў.

Калі разглядаць гармонік ў кантэксце гукаідэалу традыцыйнай народнай інструментальнай музыкі беларусаў, становіцца відавочна, што гучанне беларускага гармоніка адпавядае традыцыйным уяўленням беларусаў аб прыгажосці інструментальнага тэмбру. Як кажуць у народзе: «Патрэбна, каб гармонік заліваўся на ўсе галасы!». Таму не здзіўляе, што разгадцы таямніцы «голасу» гармоніка многія майстры прысвяцілі ўсё жыццё. Музыканты імкнуцца набыць гармонік са светлым, гучным, святочным, галасістым гучаннем. Перавага аддаецца інструментам з эфектам «разліву», што дасягаецца спецыяльнай настройкай галасоў крыху ніжэй і вышэй на інтэрвал ў некалькі герц, якая прыводзіць да дадатковай пульсацыі асноўнага тона. Паважаючы сябе гарманіст мае, як правіла, не адзін інструмент. Калі больш гучны і яркі выкарыстоўваецца для суправаджэння танцаў, то гармонік з менш

«індывідуалізаваным» гучаннем бяруць для падтрымкі спеваў ці для ігры ў інструментальным ансамблі.

Беларускія гарманісты іграюць на інструментах як фабрычнай, так і кустарнай вытворчасці. У розных мясцовасцях Беларусі склаліся свае школы па вырабу гармонікаў. Імёны знакамітых майстроў, напрыклад М. Мазаніка з г. п. Мар'іна Горка Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці, М. Балюка з в. Ставок Пінскага раёна Брэсцкай вобласці, былі добра вядомы музыкантам. На Магілёўшчыне карысталіся попытам гармонікі майстроў М. Судніка, М. Гайдукевіча, К. Кіргета і І. Іванова, у Гомельскай вобласці – П. Прыходзькі з в. Неглюбка Веткаўскага раёна, у Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці – А. Шчуроўскага з в. Целякі.

Яркія і вельмі дакладныя характарыстыкі гучання гармоніка мы знаходзім на старонках беларускай літаратуры: «Подыхам ветру прынесла *пакручасты* і *заліўчаты* гук гармоніка»(Х.Шынклер); «Скрыпка спявала яшчэ галасней, перакрываючы *сярэбраныя пералівістыя* гукі акардэона» (У. Дамашэвіч); «Гармонік… агаласіў хату *агністым* гукам» (П. Пестрак); «Наперад выйшаў хлопец, расцягнуў гармонік на ўсё плячо, і *бадзёрыя, заліхвацкія гукі* ўстрывожылі ціхую вуліцу» (У. Шахавец) [3, с. 124–125].

Адпавядаючы традыцыйнаму гукаідэалу, гармонік, тым не менш, унёс ў яго некаторыя карэктывы. Так, характэрны каларыт гучання традыцыйнага інструментальнага ансамбля, у складзе якога трывала замацаваўся гармонік, пэўным чынам змяніўся. Як адзначае А.Скорабагатчанка, гармонік «…абагаціў гучанне "даўнішняй музыкі" (ансамбля традыцыйнага складу – Н.Я.) новымі тэмбравымі пералівамі… У народнай традыцыі гэты ансамбль стаў называцца "настаяшчая музыка", увабраўшы ў сябе … новыя эстэтычныя ідэалы» [4, с. 59].

З'яўленне гармоніка на беларускіх землях значна паўплывала на музычны інструментарый беларусаў. Многія народныя інструменты, якія спрадвеку былі сімвалам непарушнасці традыцыі, былі «выціснуты» з ужытку, таму што не вытрымалі націску гармоніка, уяўляўшага сабой прыклад скарацечнасці новага часу. Гармонік – дастаткова танны інструмент, які спалучаў ў сябе меладычную і акампануючую функцыі, і на якім дастаткова лёгка было навучыцца іграць самавукам, не толькі вельмі хутка ўвайшоў у жыццё беларусаў, але, пастунова пацясніў, а потым і ўвогуле заняў месца дуды і скрыпкі. Трэба дадаць, што гармонік быў носьбітам новай, «гарадской» музыкі («бальных» танцаў, фабрычнай песні і г.д.), якая ў пачатку ХХ ст. хутка пранікала ў беларускую вёску. Паколькі новая музыка абапіралася на гамафонна-гарманічную фактуру і храматычны гукарад, яна не магла быць выканана на дудзе. Традыцыя дударскай музыкі была даволі хутка страчана, і толькі скрыпка яшчэ доўгі час канкурыравала з гармонікам, што было асабліва відавочна ў абрадавай музыцы.

Што датычыцца жанравай структуры традыцыйнай інструментальнай музыкі, то і яна, дзякуючы гармоніку, пацярпела пэўныя змены. Па рознаму ставіліся гарманісты да музыкі розных стылёвых пластоў. Часцей за ўсё яны ігралі на танцах, спрабавалі падыгрываць на вячорках застольным песням. Сярод найгрышаў не прымеркаваных да абрадаў найбольш часта выконваліся жартоўныя, бяседныя, вулічныя, расходныя і г.д. Вядучую частку рэпертуару складалі частушкі, прыпеўкі і танцы. Вельмі часта гучалі традыцыйныя і гарадскія бальныя танцы (тустэп, падэспань, лансье, матлет), маршы, сучасная аўтарская музыка, якую музыканты чулі па радыё. Менавіта гэты рэпертуар дазваляў гарманістам раскрыць у найбольшай ступені віртуознае майстэрства і здольнасць да імправізацыі.

Што датычыцца сямейна абрадавых і многіх каляндарных песень старажытнага пласта, то іх мелодыі, па словах гарманістаў, «не кладуцца на гармонік». Старадаўняя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадавая музыка, якая прадугледжвала бурдонны тып фактуры, рэдка ігралася гарманістамі, таму што канструкцыя інструмента з гатовым акордавым акампанементам стварала шэраг складаных момантаў для выканаўцы. Так, на трохрадным гармоніку магчыма было сыграць валачобную ці калядную песню, але трэба было змяніць традыцыйную фактуру найгрыша. Замест танічнага арганнага пункта дуды гарманіст чаргаваў тоніку з дамінантай, ці «басаваў» на тры акорда. Так здзяйснялася рэфармаванне традыцыйнага фальклору гармонікам: найгрышы іграліся па новаму, так, як было больш зручна гарманісту. Калі ж ўсё-такі прыходзілася іх іграць, гарманісты інтанавалі мелодыі старадаўніх песень амаль без суправаджэння, толькі час ад часу кранаалі басы. Такім чынам, рэпертуар беларускіх гарманістаў ўключаў пераважна музыку позняга паходжання. Калі улічваць, што ўваходжанне гармоніка ў музычную культуру беларускай вёскі супадала з часам разбурэння традыцыйнага жыцця, самой падставы існавання абрадаў і звязанай з імі музыкі, зразумела, што найгрышы старажытнага пласта паступова «вымываліся» з рэпертуару гарманістаў.

Дзякуючы гармоніку і новай музыцы, якую гэты інструмент прынёс ў беларускую вёску, паступова фарміравалася новае музычнае мысленне. Традыцыйныя дыятанічныя лады саступалі месца «інтэрнацыянальнаму» храматычнаму гукараду, нетэмпераваны строй змяняўся тэмпераваным, зацвярджалася фактура гамафонна-гарманічнага тыпу. За гармонікам «падцягваліся» і іншыя інструменты – скрыпка, цымбалы, балалайка. Пабудова традыцыйнай ансамблевай партытуры, якая абапіралася спрадвеку на прынцып траістай музыкі (верх-ніз і сярэдзіна), набыла адметныя рысы гамафоннай фактуры.

Такім чынам, з аднаго боку, гармонік, гэты новы для Беларусі музычны інструмент, з тэмпераваным храматычным гукарадам, вялікім дыяпазонам, фактурай гамафонна-гарманічнага тыпу *ўзбагаціў музычны інструментальны фальклор.* З другога боку – з’яўленне гармоніка прывяло да парушэння старажытнай традыцыі, паколькі істотна змяніла музычнае мысленне беларусаў адносна ладу, фактуры, пабудовы ансамблевай партытуры, прывяло да «вымірання» некаторых беларускіх музычных інструментаў і пэўнай часткі абрадавых найгрышаў старажытнага пласта. Усё гэта сведчыць аб тым, што замацаванне гармоніка ў традыцыйнай беларускай музычнай культуры нельга ацэньваць адназначна.

***Літаратура***

1. Бербераў, У. Гармонік Шчуроўскага / У. Берберοў // Мастацтва Беларусі. – 1989. – № 6. – С. 72–74.

2. Бербераў, У. Майстар белых баянаў / У. Бербераў // Мастацтва Беларусі. – 1989. – № 12. – С.47–49.

3. Гаўрош, Н. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н. Гаўрош. – Мінск: Выш. школа, 1998.

4. Назина, И. Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые / И. Д. Назина. – Минск: Наука и техника, 1979. – С. 120–124.

5. Назіна, І. Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Дз. Назіна. – Мінск: Беларусь, 1997. – С. 93–103.

6. Назіна, І. Беларуская народная музычна-інструментальная культура. Праграма-канспект для музычных ВНУ / І. Дз. Назіна. – Мінск: Беларус. Дзярж. Акад. Музыкі, 2005. – С. 67–70.

7. Скорабагатчанка, А. В. Народная інструментальная культура Беларускага Паазер’я / А. В. Скорабагатчанка. – Мінск: Бел. Навука, 1997. – С. 63–73; 90–97.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Скорабагатчанка, А. В. Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя / А. В. Скорабагатчанка. – Мінск : Бел. Навука, 2001. – С. 184–191.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ